View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE



4. LCVA. – Ф. 51. – Воп. 15. – Спр. 465.
5. LCVA. – Ф. 51. – Воп. 15. – Спр. 918.
6. LCVA. – Ф. 51. – Воп. 15. – Спр. 1935.
7. 20-lecie komunikacji w Polsce Odrodzonej / Wydaw. i nakł. Koncern Prasowy "Ilustrowany Kuryer Codzienny". – Kraków, 1939. – 543 s.
8. Drugi powszechny spis ludności z dn. 9. XII 1931 R. Mieszkania i gospodarstwa domowe. Ludność. Stosunki zawodowe. Województwo Wileńskie, bez miasta Wilna. – Warszawa, 1936. – 164 s.
9. Dziennik Wileński. – 05.11.1929. – №254, s. 3.
10. Oldtimer gallery. Trucks. GAZ-AA board platforms // Oldtimers picture gallery [Электронны рэсурс]. – 2005. – Рэжым доступу: http://www.autogallery.org.ru/gazaa.htm – Дата доступу – 20. 03. 2014.
11. Samochody FIAT 508 // Polska Motoryzacja 1918 - 1945 [Электронны рэсурс]. – 2005. – Рэжым доступу: http://old.timer.pl/fiaty.html – Дата доступу – 20. 03. 2014.
12. Tatra 30 // Tatra portal - Web site about TATRA cars and trucks [Электронны рэсурс]. – 2009. – Рэжым доступу: http://www.tatraportal.sk/?ukaz=popisky/t30_sk&lang=sk – Дата доступу – 20. 03. 2014.
13. Wołłosowicz, Stanisław. Ziemia Wileńska / Nakładem księgarni geograficznej „Orbis”. – Kraków, 1925. – 130 s.

**УДК 930.2"1914/1919"**

# ДЗЁННІКАВЫЯ ЗАПІСЫ ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***І.М. ВАШКЕЛЬ***
**Навукова-даследчая ўстанова культуры «Браслаўскае раённае аб’яднанне музеяў», Браслаў**

*Артыкул падрыхтаваны на аснове вывучэння і аналізу падзей Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі, менавіта ў Браслаўскай вобласці. Ён паказвае, што гэта былі гады велізарных чалавечых страт, агульнага масавага гераізму і трагедыі, таксама прыцягвае ўвагу да праблемы захавання ваенных пахаванняў і ўмацаванняў Першай сусветнай вайны на ўсей тэрыторіі баявых дзеянняў.*

**Они сражались…**
**И не щадили жизнь свою –**
**Теперь лежат в земле спокойно.**
**Да славься тот, кто пал в бою!**

Эпітафія складзеная ў памяць загінуўшых салдат,
пахаваных на тэрыторыі Браслаўшчыны ў в.Паўлаўка

Да гэтай пары многія не ўяўляюць, наколькі драматычнымі былі наступствы Першай сусветнай вайны для Браслаўшчыны. З восені 1915 г. да 1918 г. рэгіён падзяляла лінія фронту паміж расійскімі і германскімі войскамі. Першая сусветная вайна – гэта велізарныя разбурэнні ў прыфрантавой зоне, гэта больш за сотню расійскіх і нямецкіх вайсковых пахаванняў, гэта тысячы перасяленцаў і ўцекачоў, многія з якіх не вярнуліся ў родныя мясціны, гэта амаль знішчаная эканоміка краю, гэта эвакуацыя маёмасці ўглыб імперыі, з якой амаль нічога не вярнулася назад, гэта тысячы землякоў, мабілізаваных у расійскае войска, страты сярод якіх ніхто яшчэ не падлічыў, гэта высечаныя лясы, знішчаная жыўнасць, перарытыя акопамі, бліндажамі і іншымі ваеннымі збудаваннямі палеткі. Падзеям Першай сусветнай вайны можна прысвяціць грунтоўную манаграфію. Тысячы архіўных спраў у Беларусі, Польшчы, Літве, Латвіі, Расіі, Германіі чакаюць сваіх даследчыкаў. Шмат матэрыялаў даюць і краязнаўчыя пошукі на Браслаўшчыне. Акрамя музея, гэтым напрамкам найбольш актыўна займаюцца краязнаўцы Дрысвяцкай, Грытунскай, Відзаўскай школ Браслаўскага раёна.

Прыўзняць заслону над малавядомай старонкай гісторыі Браслаўшчыны дазваляюць матэрыялы архіваў, у першую чаргу, Расійскага Дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва ў Маскве. Дзе захоўваюцца дакументы армейскіх фарміраванняў, якія прымалі ўдзел у ваенных дзеяннях на Браслаўшчыне. Архіўныя пошукі стваральнікаў кнігі “Памяць” [6] Браслаўскага раёна дапамаглі выявіць велізарныя па аб’ёму матэрыялы. Краязнаўчыя звесткі па гэтай тэме мэтанакіравана збіраў краязнавец, настаўнік Сяргей Львовіч Адамовіч. У кнігу ўвайшла толькі малая частка таго, што было прывезена з архіваў. Асобныя старонкі вайны асветлены ў гістарычных зборніках “Браслаўскія сшыткі” (т.1, 1996; т.3, 1999, т.4, 2000). Аднак значная частка назапашанага музеем матэрыялу чакае свайго часу. У фондах музейнага аб’яднання знаходзіцца шмат экспанатаў часоў Першай сусветнай вайны: рэшткі

PolotskSU

зброі і ваенных збудаванняў, дакументы і фотаздымкі, лісты і паштоўкі і г.д. Найбольш каштоўнымі з іх з’яўляюцца дзённік ураджэнца Браслаўшчыны Сямёна Акімавіча Трушаніна [2] і альбом з фотаздымкамі расійскага салдата [8].

**Дзённікавыя запісы Сямёна Акімавіча Трушаніна**

Падчас стварэння Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея, у канцы 1980-х гадоў, у музейныя фонды быў перададзены дзёнік ўдзельніка Першай сусветнай вайны Сямёна Акімавіча Трушаніна (1893 – 1972 гг.). Сям’я Трушаніных паходзіць з Сібірскіх зямель Расіі, шмат сваякоў пражывае ў Прыбалтыке (Рыга). Дзённік быў перададзены сваякамі сям’і Трушаніных, якія пражываюць ва ўрочышчы Снегішкі каля мястэчка Відзы ў Браслаўскім раёне. Сямён Акімавіч Трушанін большую частку свайго жыцця правёў менавіта ў Снегішках, адсюль жа ён быў прызваны на фронт Першай сусветнай вайны. Сям’я Трушаніных была даволі заможнай, у часы Польскай Рэспублікі яна арэндавала навакольныя землі каля Снегішак. Дзёнік з’яўляецца цікавым адлюстраваннем эпохі Першай сусветнай вайны. Магчыма ён не ўтрымлівае значных апісанняў гістарычных падзей, але добра перадае псіхалагічны стан рускага салдата і “дух часу” Першай сусветнай вайны.

Дзённік налічвае 160 старонак, магчыма некаторыя старонкі страчаны, іх паслядоўнасць парушана. Верагодна, першы запіс у дзённіку датуецца 8 чэрвеня 1914 года. Апошні запіс з датай – лета 1950 г. На задняй вокладцы зроблены запісы з гадамі жыцця членаў сям’і Трушаніных, апошні запіс 1979 г. Большая частка дзённіка прысвечана падзеям Першай сусветнай вайны. Яна складаецца з невялікіх запісаў, у якіх сцісла апісваюцца асноўныя падзеі пэўнага дня з указаннем даты і месца дыслакацыі. Дзённік ахоплівае перыяд з мая 1915 г. па 12 студзеня 1918. Найбольш падрабязна апісан перыяд лета-восень 1917 г. Дзённік пачаты ў 1914 годзе, выкарыстоўваўся і пасля вайны, запісы ў ім рабіліся непаслядоўна, магчыма не толькі самім С.А. Трушаніным. У дзённіку згадваецца Кастрычніцкая рэвалюцыя, маецца шмат тэкстаў вершаў і рамансаў 18 – 20 ст., ёсць малюнкі і подпісы С. А. Трушаніна.

Дзённік выкарыстоўваўся як запісная кніжка. У ім можна знайсці малюнкі, кароткія запісы с сельскагаспадарчымі парадамі, запісаныя паштовыя адрасы, узгадванні пра пэўныя падзеі. Асноўную частку зместа дзённіка складаюць запісанныя тэксты вершаў і рамансаў (гэта частка названа аўтарам “Песни и стихи”) 18 – 20 ст. і дзённікавыя запісы з франтоў Першай сусветнай вайны. Запісы з вершамі і дзённікавыя запісы чаргуюцца паміж сабой. Запісы вершаў і франтавыя запісы адрозніваюцца паміж сабой стылістычна і каліграфічна. Запісы з фронту рабіліся ў “палявых умовах” алоўкам альбо цёмнымі чарнілами, якія выцвелі ад часу. Почырк Сямёна Трушаніна даволі акуратны, ён добра валодае рускай літаратурнай мовай. Але зразумела, што многія запісы рабіліся спехам, часта праз некалькі дзён пасля таго, як пэўная падзея ўжо адбылася. Многія запісы зроблены ў гутарковым стылі, з выкарыстаннем простанародных слоў і “казацкай” мовы, без знакаў прыпынку. Запісы жа вершаў і спеваў зроблены акуратным почыркам, чарнілами сінега колеру, хутчэй за ўсё ўжо ў пасляваенны час. Звычайна ўказваецца назва і аўтар твора (Шыллер, Гейне, Бернс, Фет, Лермантаў, Пушкін і г.д.) Аднак некаторыя запісы вершаў зроблены ў ваенны час, з указаннем даты і ў тым жа стылі, што і дзённікавыя запісы. Пасля некаторых вершаў і песень указана ў каго (якога салдата) і дзе яны былі перапісаны. Яны зроблены больш акуратным почыркам, магчыма тады, калі С. Трушанін меў вольны час паміж баявымі дзяжурствамі.

Першыя (па храналогіі) “ваенныя” запісы ў дзённікў змяшчаюцца ў яго апошняй часцы, якая названа “Начало службы”. У іх гаворыцца пра тое, што Сямён Трушанін быў прызваны на службу ў войску 15 мая 1915 года. 1 ліпеня 1915 года прыбыў на зборачны пункт ва ўезды горад Нова-Аляксандраўск (адміністрацыйны цэнтр Браслаўскага рэгіёна). Пазней паступіў на службу ў горадзе Казань у 2-ую заходнюю артылерыйскую брыгаду, у 2-гі батальён. У студзені 1916 эшэлонам праз Полацк прыбыў на станцыю Падсвілле на Глыбоччыне. У сакавіку трапіў на артылерыйскія пазіцыі 3-га сімбірскага палка каля вёскі Юнькі Пастаўскага раёна. Па заметцы самаго С.Трушаніна гэтыя звесткі перанесены з кішэннай запісной кніжкі ў ліпені 1917 года, таму яны знаходзяцца ў канцы дзённіка. [2]

Далей апісанне ваенных падзей працягваецца ўжо з пачатку дзённіка з даты 8 чэрвеня 1917 года. Кожны запіс пранумараваны і прысвечаны сціслому апісанню пэўнага дня 1917 года. Ваенныя апі санні перамяжоўваюцца з запісамі тэкстаў песен і вершаў, з працягам нумарацыі дзённікавых абзацаў. Аднак нумарацыя перарываецца на 122 запісу (ад 23 лістападу 1917 г.), а пазней працягваецца ўжо з 223 (ад 24 лістапада 1917). Магчыма аўтар памылкова змяніў першую лічбу 1 на 2. Апошні запіс мае нумар 234, у ім апісваюцца першыя 12 дзён студзеня 1918 года. На апошніх старонках дзённіка нумарацыі запісаў няма, храналогія не выконваецца. Адна з старонак называецца “Потери неприятеля”, далей вельмі сціслае і сумбурнае апісанне некаторых дзён жніўня, лістапада, снежня 1917 г., студзеня 1918. Магчыма гэтыя старонкі першапачаткова знаходзіліся ў іншым месцы дзённіка. Хутчэй за ўсе, гэта



Polotsk SU

"дадаткі" да асноўных запісаў, зробленыя на апошніх старонках дзённіка. Яны напісаны вельмі неразборліва, з вялікай колькасцю памылак і не маюць лагічнай сувязі паміж сабой. На апошніх старонках згадваецца Кастрычніцкая рэвалюцыя, мірныя перагаворы, "беспорядки" в арміі, будучы лёс дывізіёна, яго вяртанні з Бесарабіі і дэмабілізацыі С. Трушаніна. Не зусім зразумелы палітычныя погляды аўтара дзённіка. Па нешматлкіх запісах, можна зробіць вывад што ён не сымпатызуе бальшывікам, але і не падтрымлівае Часовы урад. Ён кажа што сацыялістычныя ідэі і бальшавікі маюць шырокую падтрымку ў арміі, часта характарызуе вайну як буржуазную. Але яго батальён не жадае здаваць зброю і падпарадкоўвацца незразумеламу камандванню і ўраду.С.Трушанін мае патрыятычныя ідэі, жадае быць верным рускай зброе і радзіме. Як і кожны салдат, ён жадае хутчэйшага заканчэння вайны, каб яго дывізіён вярнуўся ў Расію альбо Магілёў, а не заставаўся на Украіне, жыхароў якой ён называе хахламі.

На аснове дзённікавых запісаў С. Трушаніна можна зробіць наступныя вывады: С. А. Трушанін служыў связістам у артылірыйскай брыгадзе. Са студзеня 1916 года трапіў на фронт у Браслаўскі раён, потым ваяваў у Глыбокскім і Пастаўскім раёнах. Пазней С.Трушанін трапіў на паўднёвы фронт. Да гэтага яго частка знаходзілася на перафарміраванні у Казані. Магчыма С.Трушанін быў паранены, таму што ў дзённіку ёсць паштовы адрас вайсковага шпіталя ў Казані. З чэрвеня 1917 г. удзельнічаў у баявых дзеяннях на Карпатах, у Бесарабіі, у Румыніі. Артылерыйская брыгада С.Трушаніна часта была на перадавых пазіцыях, таму што яму часта прыходзілася перыдыслацыравацца, ўсталёўваць тэлеграфную сувязь пад абстрэлам праціўніка, фарсіраваць рэкі, часта згадваюцца немецкія артабстрэлы і аэрапланы. С.Трушанін быў смелым войнам, часта нёс баявыя дзяжурствы на назіральных пунктах, выконваў небяспечныя паручэнні. У экспазіцыі музея знаходзяцца ўзнагароды С. Трушаніна, у тым ліку і Георгіеўскі крыж. Прыклад запісу з дзённіка: "17 чэрвеня 1917 г. Утром рано открыт огонь. продолжался после обеда. заступил на дежурство с Кедровым. бой вели хороший. выпустили 646 бомб и 8 шрапнелей. ходил я с Е.Г. Веселовым до промежуточной. справляли линию которая была побита неприятельскими снарядами. наши участки окнчили к 5 часам. к вечеру стрельбу. левый бой продолжался" [2].

У свой вольны час С.Трушанін любіў купацца і хадзіць на паляванне, адзін альбо з саслужыўцамі. С.Трушанін вельмі любіў, як ён піша "поинтересоваться за зайцами" разам са сваімі сабакамі, якіх звалі Цітан і Буржуй. Некаторыя запісы поўнасцю прысвечанны паляванню і яго вынікам. У дзённіку знаходзіцца ўкладка з лістоў лінованага сшытка, на якой ёсць табліца, у якую Сямён Трушанін заносіў вынікі сваіх паляўнічых паходаў, а таксама поспехі сваіх таварышаў за час службы.

Па апошнім запісам у студзені 1918 года лёс дывізіёна Сямён Трушаніна быў вырашыны. 1-шы батальён передаваўся укранінцам, 2-гі – палякам, 3-ці вяртаўся ў Рассію. Апошні запіс 12 студзеня 1918 года "Погрузились на поезд". Верагоденй за ўсё 2-батальён, у якім служыў С.Трушанін трапіў на тэрыторыю Польшчы, а пазней Сямён Трушанін вярнуўся на Браслаўшчыну, якая неўзабаве ўвайшла ў склад Польшчы.

**Афіцэрскі фотаальбом расійскага салдата**

Адной з цікавейшых і каштоўнейшых памятак Першай сусветнай вайны, якая зберагаецца ў Браслаўскім музейным аб'яднанні, з'яўляецца афіцэрскі фотаальбом. Знойдзены ён быў на гарышчы аднаго з дамоў вучнямі Купчэльскай школы і некаторы час знаходзіўся там. Альбом мае адносна невялікі фармат 18 × 25 см. і складаецца з 16 аркушаў і вокладкі з цісненнем фабрычнай вытворчасці, замацаваных шнурком. Дарэчы фактура і узор вокладкі фотаальбома вельмі падобны на вокладку дзённіка С. Трушаніна. Верагодней за ўсё, альбом не аднойчы разшнуроўваўся і парадак фотаздымкаў у ім парушаны. На некаторых старонках фотаздымкі не захаваліся. Збераглося 44 здымкі. Іх можна падзяліць на некалькі груп. Ёсць фотаздымкі сямейныя, на якіх сваякі, магчыма, і сябры ўладальніка (яго прозвішча наўрад ці будзе ўстаноўлена). Найбольшая колькасць здымкаў зроблена на рэзэрвовых пазіцыях, у абозе. Некаторыя маюць подпісы, друкаваныя на машынцы і напісаныя ад рукі. Згадваюцца розныя мясцовасці ў наваколлі вёскі Опса Браслаўскага раёна: Юцішкі, Рудзі, Даўблі, Пяткунішкі, Лакоткі. Героі здымкаў – каля дрэў, на беразе возера, у палатцы, за сталом, пад час гульні ў карты. На некаторых здымках можна ўбачыць мясцовых жыхароў, дарослых і дзяцей. Сустракаюцца жартаўлівыя подпісы: "Гранд Оттель в сосоннике", "В саду. Фрукты поспели". Некалькі фотаздымкаў зроблена ў Анісімавічах. Вылучаюцца групавыя партрэты афіцэраў ў маёнтку. Пад адным з іх подпіс: "Академия Ф.Анисимовичи". Магчыма, там праходзілі нейкія курсы. [8]

Адна з самых каштоўных груп фотаздымкаў зроблена каля перадавой і тычыцца баявых эпізодаў. Налічваецца 11 такіх здымкаў, аднак яны самай дрэннай якасці. Сярод баявых здымкаў можна назваць такія сюжэты: салдаты каля падбітых нямецкіх самалётаў (3 здымкі), салдаты ў атацы, салдат у процівагазавай масцы, група воінаў каля загарадкі з калючага дроту, разлік кулямёта "Максім".



polotsk.su

Верагодней за ўсё, баявыя здымкі зроблены дзесьці ў наваколі мястэчка Дрысвяты. Мяркуючы па подпісах і ўскосных дадзеных, ваенныя фотаздымкі зроблены ў 1916-17 гадах.

У лютым гэтага года ў Мінску ў Нацыянальным гістарычным музеі працавала фотавыстава "Беларусь у гады Першай сусветнай вайны". Сюжэты здымкаў прадстаўленых на ёй супадалі з зместам афіцэрсака фотаальбома з Браслаўшчыны. Рускія салдаты ў розных мясцовасцях Заходняй Беларусі паказвалі свае баявыя і тылавыя будні. Такім чынам, матэрыял альбома з'яўляецца вельмі каштоўным гістарычным сведчаннем, які істотна ўзбагачае нашы ўяўленні аб падзеях Першай сусветнай вайны на Браслаўшчыне.

**Фартыфікацыі Першай сусветнай вайны на Браслаўшчыне**

Звыш двух гадоў Браслаўская зямля была арэнай сутыкнення і процістаяння вялізарнай колькасці расійскіх і нямецкіх войскаў. Жорсткія баі тут адбываліся восенню 1915 г. У выніку сфарміравалася стабільная лінія фронту, якая прайшла праз заходнюю тэрыторыю сучаснага Брасалўскага раёна і з'ўлялася часткаю вядомай лініі Гіндэнбурга ад Дзвінска (сучаснага Даўгаўпілса) праз Дрысвяты, Нарач на Крэва. Лінія Гіндэнбурга з невялікімі зменамі праіснавала да лютага 1918 г. – пачатку ўсеагульнага наступлення нямецкай арміі. Тэрыторыя Браслаўшчыны даволі працяглы час была не толькі плацдармам баявых дзеяннняў, але і прыфрантавым рэгіёнам, насычаным рэзервовымі часцямі, шпіталямі і тылавымі ўстановамі.

За некалькі гадоў воінскімі часцямі былі створаны цэлыя сістэмы ўмацаванняў – акопы, доты, бліндажы, рады калючага дроту, рэшткі якіх можна ўбачыць на мясцовасці і зараз. Спецыяльна для патрэб фронту была пабудавана вузкакалейная чыгунка Друя – Браслаў – Опса – Дрысвяты. Шматлікія штабы вайскавых часцей, медыцынскія, санітарныя ўстановы размяшчаліся ў Браславе, Опсе, Пеліканах, Казянах. У друі знаходзіўся пастаянны 5 тысячны гарнізон, батальёны па абслугоўванню чыгункі, базы франтавых часцей, шпіталі, санітарны цягнік.

У параўнанні з палявой фартыфікацыяй, якую выкарыстоўвала Руская імператарская армія, нямецкія ўмацаванні карэнным чынам адрозніваліся ва ўладкаванні агнявых пазіцыяў, памяшканнняў для прабывання асабовага складу і складскіх памяшканняў. У час вайны ў тагачаснай Расіі, нягледзячы на бурны перадваенны эканамічны рост, цэментная прамысловасць па сваіх магутнасцях у некалькі разоў адставала ад той, што была ў Цэнтральнай і Заходняй Еўропе. Адзін з найбуйнейшых цэментных заводаў знаходзіўся ў Ваўкавыску, адпаведна з 1915 г. гэтае прадпрыемства працавала на кайзераўскі ваены патэнцыял. [5]

Недахоп будаўнічага матэрыялу прымусіў рускую армію ўзводзіць абарончыя збудаванні з дрэва (шматнакатныя бліндажы, доўгатэрміновыя агнявыя кропкі, капаніры і інш.). Менавіта фактар выкарыстання дрэва не дазволіў захавацца рускім фартыфікацыйным палявым умацаванням у межах сучаснай Беларусі. Сітуацыя ў арміі Германіі была іншай. Узвядзенне жалезабетонных фартыфікацыйных збудаванняў вялося на працягу 1915 па 1917 г.

З часоў Першай сусветнай вайны на Браслаўшчыне захаваліся рэшткі ўмацаванняў уздоўж былой лініі фронту. Бетаніраваныя доты, бліндажы можна ўбачыць каля Відзаў, Казянаў, Дрысвятаў. Асабліва плённай з'ўляецца дзейнасць вучняў з Дрысвят, якімім кіруе Эма Лявонаўна Шавэла, вядомы арганізатар краязнаўчай працы. Дрысвяцкія краязнаўцы склалі грунтоўны "Летапіс вёскі Дрысвяты" [3], у якім ёсць асобны раздзел: "Першая сусветная вайна". Возера Дрысвяты аж да пачатку 1918 года размяжоўвалі нямецкія і рускія войскі. Рэшткі акопаў рускай арміі можна ўбачыць у наваколлі вёсак Пашавічы, Станкавічы, ва ўрочышчы Камяніцы, на астравах, нават самых маленькіх. Для абароны выкарыстоўваліся валы старажытнага гарадзішча. Каб уявіць сабе, як выглядала руская зямлянка, мы звярнуліся да апісання пазіцыі кулямётнай каманды "кольта" 278 Кромскага пяхотнага палкаў наваколлі м. Дрысвяты. "Жылая зямлянка даўжынёй 28 аршын (аршын – 71,12 см.), шырынёй 9 аршын для размяшчэння 50 чалавек, унутры сцены абшытыя дошкамі, столь з пілаваных гарбылёў. У зямлянцы маюцца: 1) па абодвух баках нары з дошак з аддзяленнямі на два чалавекі; 2) пад нарамі паліцы з дошак; 3) дзве вялікія групкі, нядаўна пабеленыя; 4) адзін маленькі стол; 5) адзін вялікі стол, вакол якога чатыры лаўкі; 6) сем вялікіх вокан на дзевяць шыбаў; 7) адзін вентылятар на акно і тры на столь; 8) у праходзе зямлянкі дашчатая падлога; 9) адны вялікія дзверы і выхад у сенцы; 10) сенцы з дошак з вуглавым выхадам, столь з пілаваных гарбылёў; 11) у сенцах адно маленькае акно і двое накладных драўляных кратаў, адна лесвіца з трох, дашчатых прыступак і адны дашчатыя дзверы з засаўкай на блоках". [6]

Больш грунтоўна рабілі свае абарончыя ўмацаванні немцы. Уздоўж фронту яны ўзвялі складаную сістэму акопаў з бетоннымі дотамі, бліндажамі, іншымі інжынернымі збудаваннямі. Па лёдзе Дрысвяцкага возера з абодвух бакоў кожную зіму нацягваліся рады калючага дроту. У цёплую пару дрот

Polotsk SU

тапілі ў вадзе. З анекалькі год уздоўж берагоў возера ў некаторых месцах утварыліся спляценні дроту, якія пазней моцна псавалі прылады рыбакоў.

Краязнаўцамі Дрысвяцкай СШ выяўлена 15 нямецкіх абарончых умацаванняў, магілы рускіх салдат паміж вёскамі Дрысвяты, Баркоўшчына і Нурвяны. Усталявана, што нямецкая лінія фронта складалася з трох ліній умацаванняў. Найбольш добра захаваліся нямецкія ўмацаванні каля вёсак Баркоўшчына і Нурвяны. Прывядзём апісанне бліндажа, зробленнае навучэнцамі Дрысвяцкай СШ падчас краязнаўчых экспедыцый: “бліндаж № 11 прамавугольнай формы. Выкарыстоўваўся немцамі ў якасці жылля для салдатаў. Захаваўся ў вельмі добрым стане. Выкарыстоўваўся мясцовымі жыхарамі ў якасці склепа. Даўжыня – 6 м., шырыня – 5 м., вышыня над паверхняй – 4 м. Добра захаваліся прыступкі і ўваход. Вышыня ўвахода – 2м., шырыня – 0.8 м. Усяго два ўваходы, адзін з іх замураваны. Унутры два вялікія адсекі. На версе маецца адтуліна круглай формы”. [3]

Немцы рабілі дзоты больш трывалымі, больш камфортнымі. Унутры многія ўмацавання былі абкладзены бярвёнамі, дзверы таксама былі збітыя з бярвення. Дзоты круглай формы з байніцамі былі абстаўлены па крузе гафрыраванай бляхай (накшталт сучасных абагравальных батарэй, яны мелі цікавую форму паўмесяца) .

У некаторых жыхароў вёскі Латочкі такія кавалкі бляхі захаваліся да нашых дзён. Яны служаць дахам для гаспадарчых пабудоў. У круглым дзоте ўверсе абавязкова была адтуліна круглай або квадратнай формы. Мясцовыя жыхары лічаць, што ў такіх дзотах стаялі “печкі-буржуйкі” і існавала сістэма абагравання з дапамогай вось гэтай гафрыраванай пліты. Такія дзоты былі невялікімі, ўсяго 2-3 метра ў дыяметры.

У сувязі з правядзеннем памятных урачыстасцяў да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны Гродзенская вобласць як адзін з найбольш пацярпелых у гады Першай сусветнай вайны беларускіх рэгіёнаў стане ў жніўні 2014 цэнтральным месцам правядзення памятных мерапрыемстваў міжнароднага значэння. У Смаргоні маюць намер адкрыць мемарыял памяці герояў і ахвяр вайны . Адначасова там адбудзецца маштабная акцыя-мітынг-рэквіем з удзелам прадстаўнікоў Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Выставы, рэканструкцыі баёў, гістарычныя тэатралізаваныя інсцэніроўкі, культурна-асветніцкія акцыі плануецца арганізаваць у гэтым годзе і ў Гродне. У перспектыве таксама музеефікацыя фартоў Гродзенскай крэпасці, стварэнне адзінага рэестра воінскіх пахаванняў, мемарыялаў і памятных знакаў.

На жаль, у нашай мясцовасці нават у плане турыстычнага выкарыстання захаваўшыгся аб'ектаў ваеннай гісторыі таго часу пакуль больш патэнцыялу, чым рэалізаваных магчымасцяў.

**Пахаванні Першай сусветнай вайны**

Падчас працы над кнігай “Памяць” было ўстаноўлена, што на Браслаўшчыне знаходзіцца каля 90 вайсковых пахаванняў. Толькі тры з іх – нямецкія (97 загінуўшых). Асноўная частка пахаванняў нямецкіх войнаў аказалася на прылягаючай тэрыторыі Літвы. Падлічана, што на Браслаўшчыне пахавана не менш за 2829 расійскіх воінаў (дакладныя звесткі па некаторых магілах адсутнічаюць). Устаноўлены прозвішчы 797 з іх. З часу выхаду кнігі адшукана яшчэ некалькі пахаванняў. Буйнейшае нямецкае пахаванне знаходзіцца ў вёсцы Гірэйшы. На каталіцкіх могілках гэтай вёскі захаваўся помнік з каменя. На пліце – крыж, а таксама надпіс, які дрэнна чытаецца. Адзін з магчымых варыянтаў перакладу: “Незломным героям”. Верагодней за ўсё, лічба 347 значыць колькасць пахаваных тут воінаў. “Чорныя археолагі” да сённяшняга дня знаходзяць вайсковыя жэтоны з прозвішчамі нямецкіх салдат Першай сусветнай вайны. Матэрыялы пра нямецкія пахаванні Браслаўшчыны музей перадаўу амбасаду Германіі. Яны зацікаквілі грамадскую арганізацыю Народны Саюз Германіі па догляду за вайсковымі пахаваннямі. Аднак добраўпарадкаваць могілкі немцы змогуць толькі пасля таго, як будуць ратыфікаваны адпаведныя пагадненні паміж Беларуссю і Германіяй. Што да расійскіх пахаванняў, то невядома, калі і каго яны зацікавяць. Нажаль, большая частка вайсковых пахаванняў Першай сусветнай вайны страчана ці знаходзіцца ў занядбаным стане.

Шмат на Браслаўшчыне месцаў пахавання салдат расійскай арміі. Яны ёсць у Браславе, Плятарове, Казянах, Мурмішках, Юцішлах, Анісімавічах, Богіна, Дрысвятах і многіх іншых месцах раёна. У інтэр’еры Богінскай царквы захаваліся мармуровыя пліты ў гонар загінўшых воінаў Разанскага, Рыжскага, Белеўскага, Тульскага пяхотных палкоў, 18-ай артылірыйскай брыгады. На плітах адзначаны прозвішчы афіцэраў і колькасць загінуўшых ніжніх чыноў. Іх агульная колькасць перавышае 700 чалавек. [6]

Намаганнямі жыхароў вёскі Дрысвяты і мясцовага святара айца Ігара даглядаюцца ваенныя пахаванні Першай сусветнай вайны ля Дрысвяцкай царквы. Гэта верагоднае месца пахавання французкага лётчыка Ларана Анры: “Лоран Анри.Чины и звания. Лейтенант французской службы.



polotsksu

Прохождение службы. Летчик-наблюдатель 5-го армейского авиационного отряда, затем 5-го авиационного отряда истребителей. 23.08.1916 г. ранен в воздушном бою. Награды. Орден Св. Георгия 4-й ст. – Приказом по армиям Северного фронта №756 от 07.09.1916 г. «за то, что, состоя в 5-м отряде истребителей 5-го авиационного дивизиона 27-го августа 1916 г., получив известие о появлении в районе Двинских позиций эскадрильи неприятельских самолетов, вылетел ей навстречу и у оз. Дрисвяты вступил в бой с превосходным по силе противником, результатом коего был быстрый спуск неприятельского аппарата. Во время боя был ранен разрывной пулей и геройской своей смертью запечатлел содеянный им подвиг».

Дата и обстоятельства смерти. 27.08.1916 г. «Вылетел по тревоге с прапорщиком О. Панкратовым в район Двинских позиций на перехват эскадрильи немецких истребителей. Несмотря на то, что не совсем оправился после полученного ранения, вступил в бой с превосходящим по силе противником в районе оз. Дрисвяты, результатом чего был быстрый спуск одного из неприятельских аппаратов. Вслед за тем, наш аппарат был внезапно, сбоку, атакован противником, причем летчик Панкратов был смертельно ранен разрывной пулей, лейтенант же Лоран, не взирая на вторичное во время боя ранение, принял управление аппаратом, выпрямил его, но видимо, потерял силы. Аппарат, быстро накренившись, пошел на снижение и упал. Су-лейтенант Лоран через несколько минут от полученных ран скончался». Архивные источники. РГИА. Ф. 496. Оп. 3. Д. 874.” [7]

У фондах Расійскага Дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва захоўваюцца матэрыялы аб воінскіх пахаваннях на Браслаўшчыне з цытатамі некаторых эпітафій: “Метко пуля разрывная, Его сразила молодца. Погибла сила молодая, С свинцом в груди, Навеки без конца.” В. Латанішкі, магіла А. Цімашэўскага; “Спите, орлы боевые, Спите спокойным вы сном. Вы заслужили, родные, счастье и вечный покой.” в. Паўлаўка, брацкая магіла. [5]

**Нарачанская аперацыя і баі за мястэка Відзы**

У канцы 1915 г. – пачатку 1916 г. на фронце мелі месца нязначныя лакальныя сутычкі, адбываліся перастрэлкі, праводзіліся вылазкі разведвальных і дыверсійных груп. На снежань расійскае камандванне планавала правядзенне аперацыіі па прарыву нямецкіх пазіцый і захопу м. Відзы з удзелам чатырох дывізій 14-га і 1-га армейскіх корпусаў. Аднак аперацыю вырашылі правясці ў летні перыяд. Падзеі на на Заходніх франтах унеслі свае карэктывы ў гэтыя планы.

У лютым 1916 г. немцы пачалі наступленне супраць французскай арміі пад Вярдэнам, імкнучыся прарвацца на Парыж. Расійскае камандванне, каб дапагчы саюзнікам прыняло рашэнне нанесці некалькі ўдараў па германскіх пазіцыях. Заходні фронт атрымаў загад правесці ў сакавіку шырокамасштабную наступальную аперацыю. Умовы для гэтага былі неспрыяльныя – пачалося веснавое разводдзе, не завяршылася падрыхтоўка часцей. Галоўны удар наносіўся ў раёне возера Нарач, астатнія падраздзяленні павінны былі праводзіць баі мясцовага значэння. 1-ая армія павінна была ажыцявіць захоп м. Відзы. [4]

Наступленне пачалося на досвітку 19 сакавіка пасля інтэнсіўнай артпадрыхтоўкі на ўчастку Мешкелі-Дэксні. Наступаючыя часці сустрэлі моцнае супраціўленне немцаў з выдатна падрыхтаваных пазіцый. У лепшым выпадку расійскім салдатам удавалася прайсці адну ці дзве лініі абароны. Пры гэтым немцы адыходзілі на рэзервовыя пазіцыі, а іх артылерыя і кулямёты літаральна змяталі атакуючых.

Поспеху наступлення не спрыялі і ўмовы надвор’я. Расійскія войскі неслі вялізарныя страты. Нягледзячы на гэта і безвыніковасць наступлення, атакі працягваліся да 27 сакавіка. Пазнейшы аналіз аперацыі пад Відзамі прызнаў дрэнную яе падрыхтоўку і арганізацыю. Відзаўская аперацыя згадваецца ў нямецкай кнізе майора Франца Хартмана “Гісторыя Прыпамеранскага 38 палявога артылерыйскага палка” [9]. З пункту гледжання германскага ваеннага, рускай артылерыі не ўдалося нанесці сурё’зныя пашкоджанні нямецкім умацаванням і ўрон жывой сіле. Быў неправільна выбраны ўчастак для атакі, сканцэнтраваных на ім сіл было яўна недастаткова. Дрэннае надвор’е: дождж, снег, а ноччу маразы толькі павялічвалі страты рускіх.

А вось як апісваецца наступленне на Відзы ў журнале баявых дзеянняў 71-га Белеўскага пяхотнага палка за сакавік 1916: “19 сакавіка. З трох гадзін ночы нашы батальёны рушылі ва ўказаным напрамку і да 4.30 ночы падышлі да рагатак, якія ўдалося параўнальна хутка прарваць. Праціўнік агню не адкрываў. Бачна было толькі, як ён пускаў чырвоныя ракеты – сігнал “наступаюць рускія”. Але як толькі батальёны наблізіліся да самых драцяных загародаў і пачалася рэзка нажніцамі, як немцы адкрылі знішчальны агонь з кулямётаў і вінтовак. Да акопаў праціўніка заставалася каля 200 крокаў. Было відавочна, што пакуль удасца прарваць наступныя перашкоды, то наступаючых застанецца занадта мала… Пачаўся світанак і да безупыннага кулямётнага агню праціўніка далучыўся ўзмоцнены артылерыйскі агонь… Страты палка: афіцэраў паранена 3, кантужана 2 і 1 прапаў без звестак, ніжніх чыноў забіта 38, паранена 510, кантужана 12 і без звестак прапала 163.

20 саквіка. Маючыя нажніцы ніжнія чыны амаль усе загінулі. Рэзаць дрот не было магчымасці, аднак ланцугі знаходзіліся паблізу іх і салдаты спрабавалі іх чым небудзь знішчыць. Да пачатку світанку ланцугі знаходзіліся перад драцянымі загародамі і тады высвятлілася, што іхнемажліва пераадолець без тэхнічных сродкаў… У палку напярэдадні гэтага бою засталося каля 1200 чалавек дарэшты прытомленых і змучаных…

25 сакавіка. У палку было 807 чалавек, пераважна хворых, з абмарожанымі канечнасцямі… Было, зрэшты, відавочна, што з гэтай аперацыі нічога не атрымаецца, але працяг яе вынікаў з тых меркаванняў, што неабходна было выканаць задачу і адцягнуць на сябе з іншых франтоў непрыяцельскія часці. Было выдадзена 90 штыкоў-нажніц, карыстацца якімі ніхто не ўмеў, з цяжкасцю навесілі іх на цэўі лож. Неўзабаве стала зразумела, што гэтыя нажніцы ніколькі не бралі драцяныя загароды… "[1].

У гэтым годзе спаўняецца 100 год Відзаўскаму касцёлу. Ён быў пабудаваны перад пачаткам Першай сусветнай вайны. Яго вежы немцы выкарыстоўвалі ў якасці назіральнага пункта і кулямётнай пазіцыі. Велічны, мураваны касцёл значна пацярпеў ад абстрэлаў русккай артылерыі. У фондах музея захоўваецца шмат фотаздымкаў з відам разбуранага касцёла. Таксама маецца друкаваная нямецкая паштоўка са здымкам вуліцы Відзаў і сілуэтам касцёла на заднім плане. Друкаваны нямецкі тэкст: "Горад Відзы, Расія, разбураны артылерыйскім абстрэлам расіян." У ніжняй часцы подпіс ад рукі "Памятка 1916-1917". Паштоўка на адвароце мае тэкст, які з прычыны невыразнага почырку вельмі дрэнна чытаецца. У першых радках гаворыцца пра моцныя маразы да -29 градусаў. Паштоўка была адпраўлена з Відзаў ў Берлін 10 снежня 1916 года.

Баявыя дзеянні на Браслаўшчыне пачаліся восенню 1915г . У выніку жорсткіх баёў сфармавалася стабільная лінія фронту, якая прайшла праз заходнюю тэрыторыю сучаснага Браслаўскага раёна і з'яўлялася часткай вядомай лініі Гіндэнбурга ад Дзвінску праз Дрысвяты, Нарач на Крэва. Тэрыторыя Браслаўшчыны даволі працяглы час была не толькі плацдармам баявых дзеянняў, але і прыфрантавым рэгіёнам, насычаным рэзервовымі часткамі, шпіталямі, санітарнымі і тылавымі ўстановамі. У выніку край зведаў значныя чалавечыя ахвяры, праблему бежанцаў, разбурэнне гаспадарак, мястэчак, вёсак.

Аднак нават у сучасным грамадстве чамусьці прынята лічыць, што Першая сусветная вайна, паколькі вялася Расійскай імперыяй, да Беларусі мела аддаленае дачыненне. Між тым, менавіта Беларусь стала арэнай баявых дзеянняў у 1915-1918 гг., На яе тэрыторыі доўгі час знаходзіліся нямецкія інтэрвенты, якія ажыццяўлялі страшную эксплуатацыю крыніц сыравіны, рабочай сілы, матэрыяльных каштоўнасцяў.

Першая сусветная вайна пакінула след ў жыцці кожнага чалаека таго пакалення. Чарговы раз Беларусь, асабліва яе заходняя частка стала арэнай канфліктаў. Паміж сваёй волі людзі былі ўцягнутыя ў глабальныя гістарычныя працэсы, апынуліся па розныя бакі палітычных, эканамічных, ідэалагічных, ваенных, культурных і іншых сістэм. Яшчэ раз адчулі ўмоўнасць любых ідэалогій і межаў. Але паўсядзённае жыццё "простага" чалавека нікуды не знікае. Яно працягваецца ў дзённіках, фотаальбомах, паштоўках, "руцінных" ваенных і грамадзянскіх дакументах. У іх няма гістарычнага пафаса і ідэалогіі, але менавіта з такіх маленькіх рэчаў складаецца "дух эпохі". Праз 100 гадоў складана зразумець – чаму казакі і сібіракі ахвяравалі сваім жыццём пры штурме Відзаў? Што рабіў ўраджэнец Брслаўшчыны С. Трушанін ў Румыніі? Навошта сярод палей Браслаўшчыны разбросаны нямецкія бетонныя ўмацаванні? Чалавек заўсёды застаецца чалавекам: нямецкія ўмацаванні значна лепш за рускія нават ва умовах рускіх палей, салдат Сямён Трушанін займаецца сваім любімым паляваннем нават на вайне ў чужой краіне. Кастрычніцкай рэвалюцыі ён прысвячае пару радкоў свайго дзённіка, ўсё астатняе гэта вершы і спевы. Няхай лозунгі і ідэалогіі застаюцца ў гісторыі. Яны непатрэбны. Нажаль, так жа, як і амаль нікому не патрэбныя воінскія пахаванні рускіх і нямецкіх салдат Першай сусветнай вайны. Яны зноў не даюць нам адказу – з кім і дзеля чаго мы ваюем? Яны толькі нагадваюць, што мы не павінны забываць пра Чалавека.

ЛІТАРАТУРА

1. "Браслаўскія сшыткі". Гістарычны зборнік. 3 выданне. 1999 г.
2. Дзённік С.А. Трушаніна. НДУК "Браслаўскае раёнае аб'еднанне музеяў". 5КП-6256. Д-400
3. Летапіс вёскі Дрысвяты. 2011
4. С.М. Морозов. История Беларуси. Конец XVIII – нач XXв. – Минск. 2011
5. "Павет". Выданне краязнаўцаў Браслаўшчыны. № 6 (43), 2005 г.
6. Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Браслаўскага раёна. – Мінск. 1998
7. А. Панцялейка, К. Шыдлоўскі. Нащ край – Браслаўшчына. – Браслаў. 1994

8. Фотаальбом НДУК "Браслаўскае раёнае аб'еднанне музеяў". 9КП-9280. Д-260
9. Franz Hartman. Geschichte des Vorpommerschen Feldartillere Regiments Nr.38. – Stettin. 1928

**УДК 316"1914/1919"**

## ДА ПЫТАННЯ АБ САЦЫЯЛЬНЫМ СТАНОВІШЧЫ Ў ПОЛАЦКУ ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***загадчык Краязнаўчага музея, філіяла НПГКМЗ І.П. ВОДНЕВА***
**Краязнаўчы музей, Полацк**

*Падзеі Першай сусветнай вайны пакінулі глыбокі след у сусветнай гісторыі. Узброеная барацьба ахапіла вялізныя тэрыторыі на трох кантынентах, у ваенны канфлікт было ўцягнута 38 краін, упершыню ў гісторыі ваеннай справы з'явіліся новыя віды ўзбраення і баявой тэхнікі. Усё гэта выклікала вялізныя разбурэнні, масавыя чалавечыя ахвяры, прывяло да зменаў на палітычнай карце Еўропы.*

Адным з галоўных тэатраў ваенных дзеянняў з'ўляліся беларускія землі. На тэрыторыі нашай краіны ў 1915 – 1918 гг. праходзіў расійска-германскі фронт, на якім з абодвух бакоў было сканцэнтравана не менш за 2,5 млн чалавек. Падчас вайны болей за 800 тыс. нашых суайчыннікаў было мабілізавана ў армію, каля 1,5 млн сталі бежанцамі, з якіх трэцяя частка так і не вярнулася на Радзіму.

Вывучаць і аналізаваць падзеі Першай сусветнай вайны пачалі адразу пасля яе заканчэння. Сучасны даследчык Б.Д. Казенка вылучыў 5 асноўных этапаў гістарыяграфіі дадзенага ваеннага канфлікту [4, с. 22]. Да найбольш значных даследаванняў першага перыяду, які ўключае 1918 – 1920-я гг., адносяцца працы "Мировая война 1914 – 1918 гг." А.М. Заянчкоўскага, "Европа в эпоху империализма" Я.У. Тарле, "Россия в мировой войне 1914 – 1915 гг.» Ю.М. Данілава, "Стратегический очерк войны 1914 – 1918 гг.". У 1930-я гг. на гістарыяграфію Першай сусветнай вайны наклаў свой адбітак культ асобы Сталіна, у выніку чаго ваенныя падзеі разглядаліся як перадумовы стварэння новага савецкага ладу жыцця замест няздольнай да існавання царскай Расіі. У той час выйшлі працы "Августовское сражение 2-й русской армии в Восточной Пруссии в 1914 г." М.Ф. Яўсеева, "Первая мировая империалистическая война 1914 – 1918 гг. Кампания 1917 г." М.А. Таленскага, "Борьба за Островец" С.А. Хмялькова і інш. У 1945 – 1960-я гг., у часы "хрушчоўскай адлігі", даследаванні насілі супярэчлівы характар, у асобных працах ускрываліся новыя факты і лічбы. Публікацыі А.А. Чуб'яна, Д. Вяржхоўскага, У. Ляхава, Ф.І. Натовіча, К.Ф. Шчарбакова друкаваліся ў часопісах "Военно-исторический журнал", "Вопросы истории", "Вестник военной истории" і інш. У наступныя дзесяцігоддзі навуковыя працы былі моцна палітызаваны і ідэалагізаваны. Большасць даследаванняў было напісана з жорскіх марксіска-ленінскіх метадалагічных пазіцый і існуючых партыйна-класавых прынцыпаў і каштоўнасцяў. І толькі з канца 1980-х гг. дэмакратызацыя грамадскай і навуковай думкі выклікала сярод гісторыкаў плюралізм поглядаў на падзеі Першай сусветнай вайны. Сталі публікавацца матэрыялы, заснаваныя на новых дакументах замежных архіваў, мемуарах актыўных удзельнікаў ваенных падзей. Шматлікія працы мінулых гадоў падвяргаліся крытыцы. У апошнія дзесяцігоддзі акрамя глыбока аналітычных прац расійскіх даследчыкаў з'явілася шмат работ беларускіх навукоўцаў, да ліку якіх адносяцца А. Бабкоў, У.Р. Карнялюк, С. Лапановіч, У. Ляхоўскі, В.І. Мамантаў, М.М. Смальянінаў, В.Н. Чарапіца, М. Шчаўлінскі і інш. Беларускія даследчыкі спрабуюць зрабіць гісторыю Першай сусветнай вайны як цэласнай ваенна-гістарычнай з'явы прадметам спецыяльнага навуковага вывучэння. Галоўнай праблемай у гэтым пытанні застаюцца фінансавыя цяжкасці вывучэння рэпрэзентатыўных дакументаў з архіваў іншых краін.

Асобныя звесткі аб размяшчэнні розных устаноў і арганізацый у Полацку падчас Першай сусветнай вайны можна знайсці ў краязнаўчых працах І.П. Дэйніса. Яго рукапісныя матэрыялы другой паловы XX ст. захоўваюцца ў фондах НПГКМЗ і полацкім занальным архіве. У 2007 г. Міхась Баўтовіч выдаў асобным выданнем адну з галоўных прац І.П. Дэйніса "Полацкая даўніна".

Даследаваннем гісторыі Першай сусветнай вайны на Полаччыне ў другой палове XX ст. займаўся полацкі краязнаўца М.А. Маніс. Ён звяртаўся да дадзенай тэмы з нагоды вывучэння падзей кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. У 1988 г. ім была выдадзена кніга аб удзельніках барацьбы за савецкую уладу на Полаччыне «Память о них жива в Белоруссии», дзе частка матэрыялу прысвячалася вывучэнню пытанняў рэвалюцыйнай сітуацыі ў 3-й арміі Заходняга фронту і арганізацыі партызанскай барацьбы падчас акупацыі Полаччыны ў 1918 г. [5]. М.А. Маніс быў таксама